# МІХАІЛ ЗІМЯНІН:
# «ІДЫЁТАЎ, ЯКІЯ НОСЯЦЦА СА СТАЛІНСКІМІ ПАРТРЭТАМІ, СТАЕ ДАГЭТУЛЬ...»

## БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА

*Партыйны і дзяржаўны дзеяч, член ЦК КПСС (1952–1956, 1966–1989), член ЦРК КПСС (1966–1989). Нарадзіўся ў 1914 г. у Віцебску. Працоўны шлях пачаў у 1929 г. рабочым паравозарамонтнага дэпо. У 1934–1936 гг. — настаўнік, дырэктар школы, пасля два гады служыў у Чырвонай Арміі. У 1939 г. закончыў Магілёўскі педагагічны інстытут, па завяршэнні яго — на камсамольскай працы: сакратар Магілёўскага гаркама, а потым абкама, першы сакратар ЦК ЛКСМБ (1940–1946). У гады Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у партызанскім руху Беларусі. У 1946 г. — другі сакратар Гомельскага абкама ВКП(б), у 1947–1953 гг. — сакратар, другі сакратар ЦК Кампартыі Беларусі. З 1953 г. — на дыпламатычнай працы: загадчык аддзеламі, член калегіі МЗС СССР, надзвычайны і паўнамоцны пасол у Дэмакратычнай Рэспубліцы В'етнам і Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспубліцы, намеснік міністра замежных спраў СССР. У 1965–1976 гг. — галоўны рэдактар газеты «Правда», у 1976–1987 гг. — сакратар ЦК КПСС. Герой Сацыялістычнай Працы (1974). З 1987 г. — на пенсіі. Памёр у 1995 г.*

## ЗАМЕСТ ПРАДМОВЫ: ЁН СТАЎ АДЗІНЫМ З УСІХ

Увесну наэлектрызаванага пераменамі 1992-га я прыехаў у Маскву, каб сустрэцца і пагаварыць з выбітнымі беларусамі, якія працавалі ў партыйна-дзяржаўных структурах савецкай сталіцы. Тады якраз задумаў кнігу, ідэя якой — з першых, што называецца, вуснаў, па зусім свежых слядах запісаць развагі, успаміны гэтых людзей на тэму, чаму разваліліся СССР і КПСС.

Аднак беларускія масквічы пабаяліся казаць праўду. Адзіны, хто пагадзіўся на гутарку, быў самы вядомы з іх на той час — Міхаіл Васілевіч Зімянін. Фактычна тое інтэрв'ю сталася падсумаваннем пражытага адным з кіраўнікоў КПСС і савецкай дзяржавы. Яму было што згадаць і, як высветлілася, пераасэнсаваць. Мне падалося — вельмі шчыра.

## «ВЫ НЕ АБАВЯЗАНЫ МНЕ ВЕРЫЦЬ, АЛЕ ЯШЧЭ ПЕРАКАНАЕЦЕСЯ: Я КАЗАЎ ПРАЎДУ»

— Нядаўна па тэлебачанні дэманстравалася шматсерыйная стужка англійскіх тэлевізійнікаў, якая, па-мойму, называлася «Другая руская рэвалюцыя». Там падзеі вясны 1985 г. паказваюцца як нейкая гіганцкая бітва процілеглых у ЦК КПСС сілаў: рэвалюцыянераў-дэмакратаў на чале з Гарбачовым, Якаўлевым і кансерватарамі пад сцягам Лігачова ды некаторых іншых. Я ў героях гэтай барацьбы не фігурую, хоць як сакратар ЦК быў у курсе ўсіх пытанняў. Дык вось, магу вас запэўніць: ніякай такой барацьбы ў той час проста не было. І не магло быць.

*— А што ж было?*

— Было калектыўнае абмеркаванне сітуацыі, выказваліся розныя думкі, але ўсе сыходзіліся ў тым, што ў краіне павінна з'явіцца дружнае, дзейснае кіраўніцтва, здольнае рушыць СССР наперад пасля працяглага застойнага перыяду канца 1980-х.

Мы выдатна ўсведамлялі сітуацыю. Калі цяпер усталёўваецца новы ідэалагічны блеф, быццам таварыш Гарбачоў адкрыў новы этап у развіцці партыі, што ён прапанаваў новыя ідэі, што ён з'яўляецца творцам перабудовы, а таварыш Якаўлеў — архітэктарам яе разам з таварышам Шэварднадзэ і яшчэ сім-тым і г. д., і да т. п., дык гэта ўсё пустыя сачыненні.

Вядома, названыя асобы імкнуліся зрабіць для краіны нешта добрае, але яны ішлі сваёй дарогай, калі дасягненне папулярнасці, задавальненне асабістых амбіцый, прызнанне сваёй ролі як вялікіх рэфарматараў і творцаў незвычайных пераўтварэнняў у жыцці нашай дзяржавы і народа яўна пераважалі.

Яшчэ раз паўтару: выпрацоўка новага курсу партыі ў красавіку 1985-га была здзейсненая кіраўніцтвам ЦК калектыўна. Гарбачоў выконваў волю ка-лек-тыў-ну-ю, а не персанальную.

Праз шмат гадоў, будучы ў Беларусі, Гарбачоў скажа пра тых людзей даволі стрымана і ў нейкай меры нават іранічна: маўляў, выйшлі са строю, хто дзе... Ён сам зрабіў усё, каб выставіць сваю фігуру «на першы план» і вылепіць з сябе «творца вялікага павароту». Вось так... Хоць, заўважце, нібыта «архітэктара» перабудовы таварыша Якаўлева ў красавіку і паміну не было.

Дарэчы, разам з Шэварднадзэ яны самыя банальныя разбуральнікі, а не стваральнікі, не рэфарматары. Асабліва Якаўлеў, удакладню дзеля справядлівасці. Вы не абавязаны мне верыць, не абавязаны прытрымлівацца майго ходу думак, не абавязаны згаджацца са мной, але хачу вас запэўніць, што вы яшчэ пераканаецеся: я казаў праўду.

— *«Казаў» — гэта неяк самаўхілена?*

— Са строю актыўна дзейных я выйшаў на студзеньскім пленуме 1987 г. — вельмі цяжка захварэў і сам папрасіў вызваліць мяне ад абавязкаў сакратара ЦК. Але ў складзе Цэнтральнага Камітэта заставаўся яшчэ два гады, калі напісаў вясной вядомую вам заяву «сотні», у якой мы, ветэраны, знялі з сябе паўнамоцтвы членаў ЦК КПСС.

## «ГАРБАЧОЎ, НА ЖАЛЬ, ВЫЯВІЎСЯ ІМПРАВІЗАТАРАМ У ГОРШЫМ СЭНСЕ ГЭТАГА СЛОВА»

— *Пра гэты эпізод, які атрымаў у свой час самую шырокую вядомасць, ёсць сэнс расказаць больш падрабязна. Ён, памятаю, быў успрыняты адНЫмі як крок неардынарны, прынцыповы, аптымістычны, а другімі — як запалоханасць, нават здрадніцтва...*

— Вядома, спачатку гэта была задума новага кіраўніцтва. У яе аснове ляжала жаданне пазбавіцца ад вялікай групы людзей, якія рабілі пэўны стрымальны ўплыў — і аб'ектыўны, і суб'ектыўны — на ўсе надзвычай развітыя маніпуляцыі, ініцыяваныя Гарбачовым — Якаўлевым — Шэварднадзе і кампаніяй.

Я з Гарбачовым быў звязаны дастаткова добрымі адносінамі нават у той час. Хоць разумеў, наколькі сур'ёзныя памылкі ён робіць, прама ўказваў на яўныя пралікі, абсалютна не ўтойваючы сваіх ацэнак тых ці іншых дзеянняў. Але адначасова, не буду хлусіць, добрых адносінаў да новага лідэра краіны не мяняў. Чаму? Лічыў, што ён пракладвае дарогу наперад, хоць і з памылкамі. Па маёй тагачаснай логіцы, іх трэба было карэктаваць, але не выступаць супраць Гарбачова асабіста.

А вось цяпер выразна разумею: тая ж ініцыяваная гарбачоўскім акружэннем заява «сотні» была звычайным жаданнем ліквідаваць стрымальны фактар. Бо ветэраны сталі ўпоперак таго, што трэба назваць патокам імправізацыі — Гарбачоў яе вялікі майстар. Але, як правіла, імправізуюць людзі хуткай, аднак жа неглыбокай думкі, неглыбокага таленту. У іх нават часу не застаецца на дастатковае асэнсаванне свайго неспадзяванага

азарэння — ці то думак, ці то імпульсаў нейкіх, якія іншы раз ідуць не так ад свядомасці, як ад падсвядомасці, — такая асаблівасць імправізацыі. І Гарбачоў, на жаль, выявіўся імправізатарам у горшым сэнсе гэтага слова.

Праўда, не без дапамогі сяброў. Ён вельмі падатлівы, на яго хутка рабілі ўплыў тыя людзі, пра якіх я нават не магу сказаць, што яны вартыя хоць нейкай павагі і даверу. Вазьміце хоць бы яго акружэнне апошняга часу... Гарбачоў жа за час кіраўніцтва змяніў тры склады вышэйшага партыйнага штаба, тры саставы! Гэта быў сапраўдны разгон, змена людзей... Хоць, паўтару, гэта мая ацэнка заднім днём, нягледзячы на тое што ўжо тады я разумеў практычна ўсё... Але пераконваў сябе: не трэба станавіцца ўпоперак — маўляў, нашкоджу. Значыць, памыляўся... З іншага боку, скажу ў сваё апраўданне: у той час я ўжо сапраўды нічога зрабіць і не мог, бо вельмі сур'ёзна хварэў. Хварэў таксама і Грамыка, многія іншыя незадаволеныя і задаволеныя, якія лічылі: калі мы выбраны — дабудзем да канца. Але я прытрымліваўся іншай думкі і пайшоў на падпісанне «заявы ста».

Калі падсумаваць усё сказанае, дык у 1985-м Крамлю стала ясна: па-старому жыць нельга. Гарбачоў сфармуляваў гэтую думку не на правах адзінага яе аўтара, а як лідэр Цэнтральнага Камітэта, які менавіта так ацэньваў сітуацыю.

## «МЫ ЛІЧЫЛІ, ШТО ДЭМАКРАТЫЮ ТРЭБА ЎВОДЗІЦЬ У ПЭЎНЫМ РЭЖЫМЕ, КРОК ЗА КРОКАМ, БЕЗ АДНАМОМАНТАВАЙ ПОЎНАЙ СВАБОДЫ»

— Ва ўсіх нас жыло разуменне: мы павінны хутчэй рухацца па шляху развіцця дэмакратыі. Яна развівалася, але стрымана. Яна скоўвалася межамі, вызначанымі кіраўніцтвам манапольнай партыі, — зусім натуральна ў аднапартыйнай сістэме.

Ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі з Захадам лічылася: раскрыццё дэмакратычных «граніц» можа прывесці да сур'ёзных ускладненняў. Павінен адзначыць: сігналаў аб трывожным становішчы ў розных рэгіёнах краіны ставала. Гэта насцярожвала, і многія лічылі, што дэмакратыю трэба ўводзіць у пэўным рэжыме, крок за крокам, поўнай свабоды адкрытай дэмакратыі да пары да часу даваць нельга.

Тут была прадуманая палітыка, гэта не проста заціск правоў і свабод, не так званая жалезная заслона ад усяго свету.

Не, развіццё ішло, яго неабходнасць, калі ўжо гаварыць па вялікім рахунку, усведамляў нават Сталін. Так-так! Ён рабіў нейкія крокі, але, зразумела, больш уяўныя. Там была падманная тактыка. Крывадушнасць, за якой хаваліся тэрор, насілле, укараненне казарменных парадкаў у краіне.

Мы пачалі дастаткова асцярожна: напрыклад, далі магчымасць вылучэння на выбарах альтэрнатыўных кандыдатур. Хоць адначасова пайшлі на манеўр, згадзіўшыся на квоты вылучэння ад розных грамадскіх арганізацый, — такім чынам дэпутацкія мандаты фактычна рэзерваваліся. Многія ж баяліся не прайсці, што было для іх да смерці падобнае. І пачалася гульня...

— *А чым яна скончылася?*

— Адзін з'езд фактыча сам сябе разагнаў, цяпер вось другі на чарзе, расійскі. Але, паўтараю, сутнасць справы заключалася ў тым, што новы палітычны курс разам са стаўкай на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага і навукова-тэхнічнага развіцця краіны павінен быў забяспечыць рэжым дэмакратызацыі, свабоду сумлення і іншых правоў чалавека для вываду дзяржавы ў нармальнае, не рэгуляванае антыдэмакратычнымі ўмовамі жыццё. Такім чынам, легенда пра Гарбачова як арганізатара вялікага павароту, сапраўды, не больш чым легенда. А вось тое, што пачалося пасля красавіка 1986-га, — ужо асобная размова.

*— Міхаіл Васілевіч, вы, як я зразумеў, былі за паступальны, але ніякім чынам не рэвалюцыйны рух наперад, і ў гэтым заключалася прынцыповае адрозненне ад пазіцыі Гарбачова і яго каманды?*

— Так. Хачу, аднак, заўважыць: пры ўсім пры тым Гарбачоў быў дастаткова разумны, культурны, адукаваны і ў той час мэтанакіраваны. Тады ён яшчэ так не вагаўся, не манеўраваў, як пачаў гэта рабіць пасля XIX партканферэнцыі, калі ўсё ў яго мазгах, як я зразумеў, перавярнулася пад націскам процілеглых сілаў.

Няўменне ўжо новых кадраў вышэйшага палітычнага кіраўніцтва забяспечыць планамерныя рамкі пераўтварэнняў эканомікі на новай аснове, калі развал, разгон старой аўтарытарна-бюракратычнай сістэмы прывёў да зніжэння паказчыкаў вытворчасці, дэзарганізацыі грамадскіх адносінаў, разам з іншымі негатыўнымі фактарамі спарадзіла нарастанне дэзарганізацыі грамадства і падрыў кіроўчай ролі партыі. На жаль, Гарбачоў на XIX канферэнцыі даў гэтаму поўны ход пад прыстойнымі прычынамі: маўляў, адкрыты шлях для шырокага развіцця дэмакратыі... Але ж усяму ёсць мера! І сталася: у тым рэжыме, да якога прыйшла краіна, — і ў палітычным, і ў эканамічным — выявіліся велізарныя правалы, узніклі супярэчнасці, нават антаганістычныя, якія, па сутнасці, не павінны мець месца пры сацыялізме, але сталі магчымымі ў выніку недальнабачнай, я сказаў бы, неразумнай, а потым і проста паражэнчай палітыкі.

У выніку, калі і Гарбачоў, і Ельцын заявілі пра канец халоднай вайны, пан Буш вельмі слушна заўважыў: перамаглі ў ёй яны, амерыканцы, са сваімі саюзнікамі. Зусім дакладна, без дыпламатыі: перамаглі нашы прынцыпы, перамаглі нашы свабоды... Пасля гэтай аплявухі абодвум крамлёўскім лідэрам Буш паслаў сваю інспектуру па краінах СНД. Усё лагічна... Раней за новага расійскага прэзідэнта і новага расійскага міністра замежных спраў. Гэта ж ганебна!

Але не думайце, што я належу да ліку тых людзей, якія разглядаюць ход цяперашніх падзей, тым больш перспектыву развіцця краіны толькі ў чорным колеры. Я не стаўлю пад сумненне дэмакратычныя імкненні самога народа, я не стаўлю пад сумненне сумленнасць дэмакратычных імкненняў шматлікіх партый, якія нічога агульнага не маюць з камуністычнай партыяй, — яны па-свойму ўсё гэта разумеюць, своеасабліва ўсведамляючы ход падзей, іх спружыны, унутраныя прычыны, заканамернасці, асноўныя фактары развіцця краіны. Гэта іх права так разумець — на тое яна і свабода. Я нікому не збіраюся навязваць тое, як думаю і разважаю сам. Не, я асабіста не лічу, што наша краіна і наш народ пацярпелі паражэнне ў якой бы там ні было вайне і барацьбе — не, наш народ непераможны.

## «ЧЫМ УСЁ СКОНЧЫЦЦА — АДЗІН БОГ ВЕДАЕ, А ЕЛЬЦЫН — НЕ»

*— Прыгавор Буша, на ваш погляд, правільны толькі часткова?*

— Пацярпела паражэнне наша палітычнае кіраўніцтва. Так, у выніку яго памылак, пралікаў ворагу ўдалося раз'яднаць славянскія, астатнія народы краіны. Але настане час, і яны злучацца, яны нікуды ад гэтага злучэння не падзенуцца пад пагрозай гібелі вялікага славянскага адгалінавання чалавецтва — я лічу, усё гэта мае сваю ўнутраную логіку развіцця падзей.

І выснова: звароту да старога быць не можа — ні да аднапартыйнай сістэмы кіравання грамадствам, ні тым больш да аднапартыйнай сістэмы камуністычнай партыі, таму што калі гэтую Камуністычную партыю забараніў яе ж рэнегат, дык ніводнага мітынгу ў яе абарону не адбылося...

Гэта ні ў каго не выклікала катэгарычнага асуджэння. Так, вядома, памыляліся, глупстваў нарабілі, і трэцяе, і чацвёртае, і пятае... Але не было такога, як цяпер, не было та-

кой арганізаванай галадухі амаль праз паўстагоддзя пасля заканчэння вайны, на роўным месцы… На мой погляд, у народзе выспявае праціборства вельмі складаных пачуццяў, я гэта адчуваю, калі хаджу, стаю ў чэргах за малаком.

Прымошчванне ў хвост капіталізму, толькі ў хвост — у авангард нас ніхто не выпусціць, — будзе такім зняважлівым для краіны і народа, што ён гэтага нікому не дазволіць. Ён прайшоў вялікі шлях, з якога многае павінна быць захавана, умацавана, развіта і прымножана, узбагачана досведам сусветнага развіцця, арганічна спаяна такім чынам, каб не было вяртання да старога, але не было і такога рэгрэсіўнага адыходу ў капіталізм, тым больш у дзікі, перыяду першапачатковага назапашвання капіталу, як цяпер часта гавораць. Павінен быць выхад на новыя параметры гістарычнага развіцця, сапраўды дэмакратычныя, што адкрываюць перад народам новыя гарызонты.

Краіна цяпер развіваецца вельмі супярэчліва. Я, напрыклад, уважліва назіраю за Ельцыным, ведаю яго недахопы і вартасці — чалавек з характарам, з амбіцыямі, як тэарэтык нічога не варты, ён адхрысціўся ад адной ідэалогіі і не прыйшоў да другой. Цяпер заявіў, быццам ён сацыяліст, але вядзе краіну ў капіталізм — дарэчы, не ён вядзе, а сілы, што стаяць за ім, яны разам падштурхоўваюць нас да капіталізму… З гэтай камандай ён ні да чаго добрага Расію не давядзе. Боязна, аднак, што могуць дзяржаву падрасцягнуць. І ўсё ж мне хочацца думаць, што Ельцын, як рускі чалавек, цяпер пачынае ўсведамляць тое, што адбываецца. Я не з'яўляюся яго паклоннікам і прыхільнікам, але быў бы вельмі рад, каб ён апамятаўся і нешта зрабіў для таго, каб гэтая краіна стала на ногі. Але пакуль што, на жаль, справа ідзе да горшага. І чым усё скончыцца — адзін Бог ведае, а Ельцын — не.

Нягледзячы ні на што, я веру ў наш народ.

## «У 1970-я МЫ МЕЛІ ЎСЁ, АКРАМЯ АДНАГО — ПАЛІТЫЧНАЙ ВОЛІ!»

*— Міхаіл Васілевіч, вы шмат і своеасабліва расказвалі пра апошняга лідэра былых СССР і КПСС. Цікава пачуць таксама пра яго папярэднікаў. Возьмем, напрыклад, Брэжнева. Для вас, відаць, не сакрэт, што ў народзе нябожчык Генсек успрымаўся, мякка кажучы, зусім не інтэлектуалам, хоць апошнім часам пачынаюць цаніць дадзеную ім стабільнасць жыцця, упэўненасць у дні заўтрашнім…*

— Не ўсё тут проста. Будучы здаровым і моцным, Брэжнеў заставаўся цвёрдым прагматыкам, які паставіў кропку на хрушчоўскіх хістаннях, што ў многім парушылі парадак у краіне, ён і Касыгін лічылі найгалоўнейшай задачай менавіта стабілізацыю становішча ў дзяржаве, уздым жыццёвага ўзроўню на больш высокі парадак. Не скідвалася таксама з рахунку паступовае, але паступальнае развіццё дэмакратыі ў краіне, савецкай дэмакратыі, дзяржаўнай…

*— Вядома, аднак, што погляды двух лідэраў таго часу не ва ўсім супадалі?*

— Так, асабістае саперніцтва мела месца… На момант пачатку сваёй работы Брэжневу ўдалося згуртаваць кадры партыі і дзяржавы: ён аб'яднаў іх думкай пра спакойную, дружную работу. Былі намечаныя пэўныя планы, прадуманыя найважнейшыя пазіцыі, і краіна адразу пайшла па шляху ўздыму.

На шчасце, менавіта ў гэты момант (на шчасце для таго часу) адкрыліся каласальныя нафтавыя залежы ў Цюменскай вобласці. Мы ў пэўным сэнсе маглі тады канкураваць з арабскімі нафтаздабываючымі дзяржавамі. У выніку, я думаю, СССР атрымаў парадку двухсот мільярдаў, якія імгненна пайшлі ў ход. У значнай меры гэтыя гіганцкія на той час сумы былі пушчаныя ў справу, але адначасова яны пайшлі на звычайнае праяданне. Напрыклад, вырашылі закупляць хлеб… Замест фарсаванага развіцця сяла!

Пасля ўвядзення ў севазварот цалінных і залежных зямель рост ураджайнасці хоць і павялічваўся, але марудна, патрэбнасці краіны не забяспечваліся. Замест дзейснай увагі да патрэбаў сялянаў на-гара выдаваліся бясконцыя пражэкты, а прылаўкі запаўняліся прадуктамі, купленымі за мяжой.

Паралельна ў значнай меры развіліся спажывецкія настроі. Бо ўраўняльныя тэндэнцыі, сістэма аплаты зніжалі зацікаўленасць людзей у добрасумленнай працы. Дарэчы, сённяшняе так званае ўваходжанне ў рынак — гэта стварэнне той самай матэрыяльнай зацікаўленасці, якая раней сапраўды недаацэньвалася.

У выніку людзі жылі вельмі сціпла, а сёй-той нават галаднавата. У прыватнасці, настаўнікі і дактары. Як сакратар ЦК я на працягу пяці гадоў дабіваўся павышэння ім зарплаты — і дабіўся ўсё ж, але прыбаўка была вельмі сціплая — на адну трэць. А яны стаялі ніжэй сярэдняга ўзроўню зарплаты па краіне... А гэта ж вядучыя атрады інтэлігенцыі! Аснова інтэлігенцыі ў любой краіне...

Такім чынам, нягледзячы на тое што ў 1960–1970-я гг. на поўную моц была ўсвядомленая неабходнасць інтэнсіфікацыі вытворчасці, павышэння яе навукова-тэхнічнага ўзроўню, але ад слоў да справы, тым не менш, была дыстанцыя велізарнага памеру.

У сувязі са сказаным заўважу: асноўная слабасць Брэжнева заключалася ў задавальненні ад карціны знешняга дабрабыту, ён увесь час імкнуўся падтрымліваць яе і нас на гэта нацэльваў: «Не ганьце краіну, крытыкуйце, але ў меру» і г. д., і г. д.

*— Ці спрабаваў хто-небудзь дастаткова жорстка пярэчыць Генеральнаму сакратару?*

— Так. Напрыклад, Касыгін, які ў адносінах да эканамічных рэалій быў настроены куды больш крытычна, востра, жорстка. У выніку яны зразумелі, што давядзецца развітацца. Касыгін пайшоў адпачываць. Праўда, гэтаму паспрыяла яго ж неасцярожнасць — у час катання перавярнуў лодку. Аляксея Мікалаевіча ледзь выратавалі. Здарылася гэта пад Масквой, на дачы. Пасля лячэння ён значна аслаб, што і паспяшаўся скарыстаць Брэжнеў — замяніў Старшыню Саўміна старым сябрам Ціханавым, хоць той, вядома, ні ў якое параўнанне са сваім папярэднікам не ішоў.

*— Калі ўжо мы закранулі тэму «палацавых пераваротаў», дык раскажыце і пра адстаўку трэцяга з афіцыйных кіраўнікоў краіны таго часу, Падгорнага?*

— Ён пакінуў палітычную арэну, калі спрабаваў арганізаваць, дакладней, падрыхтаваць замену Генсека менавіта Касыгіным, адразу пасля інсульту ў Брэжнева. Мікалай Віктаравіч дзейнічаў дастаткова асцярожна, ён быццам бы праяўляў цікавасць да магчымых кадравых перастановак. Але акружэнне Брэжнева інтэрпрэтавала сітуацыю больш жорстка: Генеральнаму далажылі дыспазіцыю ў зусім пэўным святле, і той пастараўся як мага хутчэй адхіліць Падгорнага. Нават пасля свайго вельмі цяжкага інсульту Брэжнеў не лічыў магчымым адыходзіць ад спраў.

Але вернемся крыху назад. Тое, што нам тады здавалася шчасцем (я маю на ўвазе нафтавы бум), на самай справе адтэрмінавала высвятленне асноўнай праблемы затрымкі краіны з пераходам на сапраўды інтэнсіўныя метады дзейнасці ў эканоміцы, на паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу, што вызначалася ў першую чаргу суб'ектыўным фактарам — разумным стратэгічным кіраваннем краінай. Я маю на ўвазе палітычную, эканамічную стратэгію, не толькі ваенную. На жаль, гэтага не было.

І, мне здаецца, Савецкі Саюз к канцу эпохі Брэжнева ўяўляў з сябе нейкую гіганцкую птушку, якая распластала свае крылы ад Ціхага акіяна да Балтыкі. Моцная, магутная, вялізная птушка не ўзлятала толькі праз адсутнасць аднаго фактару — волі да гэтага. Палітычнай... Таму што хоць Брэжнеў і быў хворы, але ўсялякае выступленне з крытычнымі заўвагамі наконт нашага адставання, нават самы нязначны намёк на

сур'ёзную прынцыповую крытыку ўспрымаў з варожых пазіцый... Не выпадкова шэраг разумных, вартых дзеячаў менавіта тады пакінулі свае пасады, якія занялі людзі больш слабыя, затое асабіста больш блізкія да Брэжнева.

*— Пра чый сыход вы, Міхаіл Васілевіч, шкадавалі, шкадуеце?*

— Напрыклад, Шалепіна, разумнага, валявога чалавека.

*— Кім ён быў тады?*

— Сакратаром ЦК, членам Палітбюро. Дарэмна яго знялі. Несправядліва абышліся і з Воранавым. Не хачу сказаць, што значнай велічынёй быў украінскі сакратар Шэлест, але ён належаў да людзей сур'ёзных, дзейсных і сумленных. Былі і многія іншыя. Уключаючы рангам ніжэй. Мне імпанавалі ўпартыя, незгаворлівыя міністры, якіх менавіта за іх, так сказаць, яршыстасць ад розуму замянялі на больш разважлівых, хоць і слабейшых у прафесійных адносінах. На жаль, асабістая адданасць кадраў у той час усё больш узнімалася ў цане. Вакол Брэжнева склалася штабная група з памочнікаў, розных неафіцыйных саветнікаў на чале з Цуканавым і Аляксандравым. Менавіта да іх сцякалася ўся інфармацыя, прызначаная для кіраўніка дзяржавы, менавіта там яна сартавалася на «патрэбную» і «памылковую». Бліжэйшае акружэнне, уласна, і вызначала адносіны Брэжнева да людзей і спраў.

Карацей кажучы, пры знешне добрым выглядзе рух краіны стопарыўся. А калі спахапіліся (прыярытэт у гэтым «прачынанні» за Андропавым), дык было ўжо надзвычай цяжка змяніць сітуацыю.

## «ПАКУЛЬ АНДРОПАЎ НЕ СТАЎ КІРАВАЦЬ СССР, ЁН ЛІЧЫЎ ЗА ЛЕПШАЕ МАЎЧАЦЬ»

*— Андропаў загаварыў іначэ пры Брэжневе?*

— Не, у рангу кіраўніка дзяржавы. Да таго ён лічыў за лепшае маўчаць. Афіцыйна маўчаў, хоць у асабістых размовах нам рознае здаралася закранаць.

Черненка, безумоўна, паводзіў сябе больш стрымана, бо доўгія гады быў памочнікам Брэжнева і дзякуючы сваёй асабістай адданасці якраз і ўзняўся на такую вышыню. Як палітычны дзеяч, арганізатар, не гаворачы ўжо пра стан здароўя, ён даволі сярэдні.

*— У народзе рэпутацыя Андропава дастаткова высокая, многія шчыра лічаць, што калі б не здарылася з ім смяротная хвароба, ён вывеў бы краіну з тупіка. Ці так гэта на самай справе? Ёсць, праўда, і іншы пункт погляду, вельмі злосны, дакладней, зларадны: калі б яму пашанцавала са здароўем і ён пабыў у Крамлі даўжэй, дык сёння яго імя паласкалі б разам з імем Брэжнева — маўляў, і ў яго нічога б не атрымалася...*

— Да пары да часу, аж да прызначэння Андропава Генеральным сакратаром, нас звязвала шматгадовая дружба з часоў камсамольскага юнацтва. Пасля знішчэння лідэра ЦК УЛКСМ Аляксандра Косарава і яго акружэння мы адначасова сталі на чале кіраўніцтва камсамольскімі арганізацыямі — я на Беларусі, а Юрый Уладзіміравіч — у Карэла-Фінскай рэспубліцы. Так і крочылі потым побач.

Разумны, здатны, у многіх адносінах, безумоўна, прыстойны, гаспадар свайго слова і да пары да часу добразычлівы чалавек, ён з тых людзей, якія аптымістычна заражаюць. Але гады работы ў Камітэце дзяржбяспекі вельмі моцна змянілі Андропава,

*— На Лубянцы ён прабыў гадоў дзесяць?*

— Нават больш. Гэты час зрабіў яго больш насцярожаным, непрыміральным, выхаваў нейкія негатыўныя якасці, якія спачатку былі скрытыя, бо ён якіх-небудзь асаблівых

рэпрэсій не дапускаў, няма ў яго славы карніка, але гэтая служба ўсё ж зрабіла яго не толькі аб'ектыўным, але і непрыемна жорсткім, да непрымальнага. Калі, напрыклад, новы Генсек зразумеў, што ў атмасферы брэжнеўскага «застою» і дабрадушнасці дысцыпліна рэзка ўпала, ён запатрабаваў — зусім правільна — рэзкага змянення. Але даходзіла да анекдатычнага: лавілі прагульшчыкаў у кінатэатрах, магазінах...

На жаль, работа ў КДБ давала Андропаву арыентацыю ва ўсіх негатыўных момантах, ён добра ведаў небяспечную абстаноўку ў краіне, але яна ж пазбаўляла яго практычнага досведу па ажыццяўленні пераўтваральных мераў. Для таго каб кіраваць, трэба разумець, як гэта робіцца, неабходны адпаведны досвед. Не ведаючы самалёт, лётчык не бярэцца яго пілатаваць. А ў нас многія палітыкі браліся, а цяпер нават асабліва завіхаюцца ў дзяржаўным кіраванні, не маючы ў ім ніякага досведу! Тым не менш яны ўпэўнены, што могуць!

Я ўжо не гавару пра хлопчыкаў ад эканомікі з кандыдацкімі і доктарскімі званнямі, звярнуся да прыкладу акадэміка: Шаталін ніколі не меў ніякага досведу кіравання дзяржавай, але абвясціў сябе кіраўніком дзяржаўнай эканамічнай школы, што рвецца да перабудовы. Калі цяпер ён пераканаўся ў поўным банкруцтве сваёй 500-дзённай «праграмы», дык піша дыяметральна процілеглае таму, што гаварыў учора. Ну проста дзіва!

Дарэчы, вернемся да Андропава. Дык вось, ён, аналагічна, не меў належнага практычнага досведу: ён назіраў, ён удзельнічаў збоку, змагаўся, так сказаць, са знешняй і ўнутранай контррэвалюцыяй, гэта ўсё правільна. Але ў яго не было, паўтараю, багажу, раўнацэннага таму, напрыклад, якім валодаў Касыгін ці Усцінаў у сферы абароны — гэта найбуйнейшыя арганізатары. Ці ўзяць Даўгіх — сакратар ЦК, кандыдат у члены Палітбюро, які не спадабаўся Гарбачову, а ён жа вельмі таленавіты арганізатар цяжкой індустрыі! Вельмі яркі чалавек з велізарным досведам кіравання адышоў убок, дакладней, яго «адышлі»...

У Андропава, паўтару, такія неабходныя якасці адсутнічалі. І ў гэтым плане яго смерць у выніку хваробы была заканамерная... Паўтару: не хачу яго абгаворваць, мы доўга сябравалі, хоць у канцы жыцця я не змог пагадзіцца з некаторымі прынцыповымі рэчамі, якіх ён прытрымліваўся, і ў адносінах наступіў разрыў...

## «АЎТАРЫТАРНАСЦЬ СІСТЭМЫ ЗАКЛАЎ ЯШЧЭ ЛЕНІН, А СТАЛІН УЗВЁЎ ЯЕ Ў ПРЫНЦЫП ТЫРАНІІ»

— *Ці дапускаў Андропаў магчымасць спрэчкі з суразмоўцам на аднолькавых правах?*

— Так, вядома. Але апошняе слова пакідаў, натуральна, за сабой. Натуральна з пункту гледжання той сістэмы кіравання, якая была ў нас.

Адхілюся на імгненне ўбок. Майце на ўвазе: я нашу сістэму кіравання, пачынаючы ад Леніна, лічу аўтарытарнай. У Леніна гэты аўтарытарызм ідзе з прычыны велізарнага, на парадкі вышэйшага, чым у акружаючых яго людзей, інтэлекту, волі і зноў жа досведу арганізатара ў гіганцкіх маштабах, з якімі нічога не можа параўнацца. Ён чалавек стагоддзя ў літаральным сэнсе гэтага слова, што б пра яго цяпер ні гаварылі, як бы яго ні паказвалі, як бы з яго ні здзекаваліся б... Усе, хто цяпер вымазвае яго чорнай фарбай, пігмеі ў параўнанні з ім.

Але, на жаль, праўда такая, што аўтарытарная сістэма кіравання пачалася менавіта з Леніна. Але тады гэта тлумачылася сілай яго аўтарытэту, хоць з ім і спрачаліся, нават дыскутавалі, напрыклад, па Брэсцкім міры, па прафсаюзах, па фарміраванні Савецкага Саюза... Апаненты, аднак, разумелі: перад імі махіна, глыба, — і ў канчатковым выніку адступалі. З усмешкай ці без яе, з прабачэннямі ці без іх, але ўсё роўна схіляліся перад сілай асобы Леніна. Менавіта такі ленінскі аўтарытэт і заклаў тую асно-

ву аўтарытарызму, якую Сталін узвёў у прынцып тыраніі, дэспатызму, асабістай дыктатуры, ператварыўшы кіраўніцтва краінай у тыранічнае.

Хоць такім яно было не заўсёды, не. Сталін ішоў да гэтага на мяжы 1920–1930-х гг. ва ўмовах унутрыпартыйнай барацьбы. Ён перамог сваіх апанентаў паслядоўнымі, няўхільнымі, жалезнымі, я сказаў бы, і падступнымі, і подлымі, і жорсткімі, страшэнна жорсткімі, тэрарыстычнымі метадамі, у выніку якіх перыяд сталінскага кіравання можна назваць перыядам нейкай сталінскай д'ябаліяды. Нехта з паэтаў назваў яго вурдалакам. Вельмі дакладна!

Сталін зацвердзіў аўтарытарную сістэму, хоць дакументальна ўсё афармлялася такім чынам, быццам яна дэмакратычная, ленінская, паслядоўная, калектыўная і г. д. На самай жа справе размову трэба весці пра вельмі жорсткую, але страшна скрытую дыктатуру.

Хрушчоў, што раскрытыкаваў культ Сталіна, так і не здолеў замахнуцца на сталінскі рэжым дыктатуры, на рэжым аўтакратычнага, аўтарытарнага кіравання краінай, партыяй і дзяржавай — ён, заўважце, гэты рэжым не крануў.

Таму, калі гавораць пра вялікую заслугу Хрушчова як адкрывальніка новай эпохі, змагара, што зламаў хрыбет сталінізму, дык я павінен сказаць наступнае. Так, у асабістай мужнасці гэтаму чалавеку адмовіць нельга, як нельга, напрыклад, адмовіць яму і ў яго ініцыятыве выкрыцця Берыі, у крытыцы культу... Павінен, праўда, агаварыцца, што падвяргаючы Сталіна крытыцы за рэпрэсіі, Хрушчоў тым самым у нейкай меры замольваў уласныя грахі. Таму што ён у гэтых рэпрэсіях удзельнічаў і як сакратар МГК, і як сакратар Кампартыі Украіны. Я ведаю людзей, яны жывуць і цяпер, на якіх Мікіта Сяргеевіч падпісваў заключэнні аб неабходнасці арышту...

Пасля Хрушчова і крытыкі яго валюнтарызму, суб'ектывізму, парушэння прынцыпаў калектыўнага кіраўніцтва да ўлады прыйшоў Брэжнеў. Вось вам і доўгачаканая калектыўнасць: усё дружна, весела, але ж фактычна аўтарытарная сістэма кіравання працягвала жыць.

У тым, што наспела к 1985 г., была таксама і неабходнасць ліквідацыі гэтай сістэмы кіравання і ў партыі, і ў дзяржаве.

## «КПСС ТРЭБА БЫЛО ПЕРАЎТВАРЫЦЬ У САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ПАРТЫЮ ПРАЦОЎНЫХ»

*— Міхаіл Васілевіч, якой бачылася перспектыва перабудовы вам асабіста?*

— З пераходам на дэмакратычныя метады кіравання я прытрымліваўся той жа канцэпцыі, што і Рыжкоў. Гэта значыць, па-першае, выстройваць новыя звёны і сістэмы з выключэннем старых толькі тады, калі навінкі, што называецца, адпрацаваны. Але гарбачоўскае акружэнне, іх паслядоўнікі аддалі перавагу іншай методзе: разбурыць усё дашчэнту, а там хоць трава не расці! Планаванне высеклі, услед — сістэму дзяржаўнага забеспячэння... Выйшлі, праўда, на дагаворныя адносіны, але яны не адбыліся. У выніку рост дыспрапорцый. Пасля спланаванага пахавання арганізаванага цэнаўтварэння атрымалі інфляцыю, а цяпер і гіперінфляцыю — хто за гэта адкажа?

*— А як, на вашу думку, трэба было распарадзіцца лёсам партыі?*

— Апошні праект праграмы рыхтаваўся пры маім удзеле. Я стаяў на наступным: неабходна аднаўленне гістарычнай назвы — сацыялістычная партыя.

*— Нават так, не сацыял-дэмакратычная?*

— Сацыялістычная партыя працоўных. Хоць нічога дрэннага не бачу і ў памянёным вамі варыянце, што нагадвае першапачатковы мінскі — РСДРП. Больш таго, з улікам

рэпрэсій не дапускаў, няма ў яго славы карніка, але гэтая служба ўсё ж зрабіла яго не толькі аб'ектыўным, але і непрыемна жорсткім, да непрымальнага. Калі, напрыклад, новы Генсек зразумеў, што ў атмасферы брэжнеўскага «застою» і дабрадушнасці дысцыпліна рэзка ўпала, ён запатрабаваў — зусім правільна — рэзкага змянення. Але даходзіла да анекдатычнага: лавілі прагульшчыкаў у кінатэатрах, магазінах...

На жаль, работа ў КДБ давала Андропаву арыентацыю ва ўсіх негатыўных момантах, ён добра ведаў небяспечную абстаноўку ў краіне, але яна ж пазбаўляла яго практычнага досведу па ажыццяўленні пераўтваральных мераў. Для таго каб кіраваць, трэба разумець, як гэта робіцца, неабходны адпаведны досвед. Не ведаючы самалёт, лётчык не бярэцца яго пілатаваць. А ў нас многія палітыкі браліся, а цяпер нават асабліва завіхаюцца ў дзяржаўным кіраванні, не маючы ў ім ніякага досведу! Тым не менш яны ўпэўнены, што могуць!

Я ўжо не гавару пра хлопчыкаў ад эканомікі з кандыдацкімі і доктарскімі званнямі, звярнуся да прыкладу акадэміка: Шаталін ніколі не меў ніякага досведу кіравання дзяржавай, але абвясціў сябе кіраўніком дзяржаўнай эканамічнай школы, што рвецца да перабудовы. Калі цяпер ён пераканаўся ў поўным банкруцтве сваёй 500-дзённай «праграмы», дык піша дыяметральна процілеглае таму, што гаварыў учора. Ну проста дзіва!

Дарэчы, вернемся да Андропава. Дык вось, ён, аналагічна, не меў належнага практычнага досведу: ён назіраў, ён удзельнічаў збоку, змагаўся, так сказаць, са знешняй і ўнутранай контррэвалюцыяй, гэта ўсё правільна. Але ў яго не было, паўтараю, багажу, раўнацэннага таму, напрыклад, якім валодаў Касыгін ці Усцінаў у сферы абароны — гэта найбуйнейшыя арганізатары. Ці ўзяць Даўгіх — сакратар ЦК, кандыдат у члены Палітбюро, які не спадабаўся Гарбачову, а ён жа вельмі таленавіты арганізатар цяжкой індустрыі! Вельмі яркі чалавек з велізарным досведам кіравання адышоў убок, дакладней, яго «адышлі»...

У Андропава, паўтару, такія неабходныя якасці адсутнічалі. І ў гэтым плане яго смерць у выніку хваробы была заканамерная... Паўтару: не хачу яго абгаворваць, мы доўга сябравалі, хоць у канцы жыцця я не змог пагадзіцца з некаторымі прынцыповымі рэчамі, якіх ён прытрымліваўся, і ў адносінах наступіў разрыў...